УПРАЎЛЕННЕ АДУКАЦЫІ ГОМЕЛЬСКАГА АБЛАСНОГА
ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА
Установа адукацыі “Светлагорскі дзяржаўны індустрыяльны каледж”

Аўтар Кавальчук Н.С.
Камісія моўных дысцыплін

# “Расказваю пра вайну, бо ненавíджу яе”

## Распрацоўка ўрокаў па аповесці

## В. Быкава “Знак бяды”



Светлагорск
2015/2016 навучальны год

Аўтар: Кавальчук Наталля Сяргееўна, выкладчык беларускай мовы і літаратуры першай кваліфікацыйнай катэгорыі УА “Светлагорскі дзяржаўны індустрыяльны каледж”

## Анатацыя

У дадзенай метадычнай распрацоўцы прапаноўваецца варыянт занятка па аповесці В.Быкава “Знак бяды”, які дапаможа ўвесці навучэнцаў у свет яго герояў, выклікаць у іх цікавасць не толькі да яго твораў, а таксама і асобы пісьменніка, грамадзяніна, патрыёта.

Дадзены матэрыял дапаможа не толькі ўзнавіць веды пра асноўныя этапы жыцця і творчасці аўтара, раскрыць яго феномен у беларускім мастацкім слове, але і акрэсліць асаблівасці яго творчасці, на прыкладзе аповесці “Знак бяды” паказаць суровую праўду вайны і гуманізм у паказе народнага подзвігу, прасачыць, як у творы ўслаўляецца чалавек, яго духоўныя каштоўнасці, будзе садзейнічаць і пашырэнню гістарычнай дасведчанасці навучэнцаў, выхаванню гонару за сваю багатую гісторыка – культурную спадчыну.

Прапанаваны матэрыял будзе карысны выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры і дапаможа пры правядзенні ўрокаў па творчасці В.Быкава.

Разгледжана на пасяджэнні камісіі моўных дысцыплін

Пратакол № ___ ад “____” _______________ 2016 г.

Старшыня цыклавой камісіі _____________ / Асташкова В.С./

Рэгістрацыйны нумар _________

## Уводзіны

Для любой навучальнай установы адной з асноўных задач застаецца выхаванне асобы навучэнца з уласцівымі ёй якасцямі грамадзяніна, патрыёта нашай краіны, асобы, здольнай аддаваць усе свае веды на карысць Бацькаўшчыны. У вырашэнні гэтай высакароднай задачы пачэснае месца належыць грамадзянска-патрыятычнаму выхаванню менавіта на ўроках беларускай літаратуры пры вывучэнні творчасці таго ці іншага пісьменніка. Бо менавіта яму наканавана стаць тым сродкам, які будзе садзейнічаць нацыянальна-культурнаму абуджэнню беларускага народа праз пазнанне непаўторнасці яго гістарычнага шляху, матэрыяльнай і духоўнай культуры, праз усведамленне яе нацыянальнай каштоўнасці ў суквецці славянскай, еўрапейскай і сусветнай культуры. Менавіта яно павінна закласці аснову для фарміравання чалавека-грамадзяніна, гаспадара сваёй зямлі, адказнага за вынікі сваёй працы і за лёс сваёй краіны.

У наш час, калі адбываецца ўзрастанне сацыяльна-псіхалагічных адрозненняў паміж пакаленнямі, змяняецца рытм жыцця, хутка мяняюцца быт, густ, звычаі – у сучасных жыццёвых калізіях патрабуецца ўсямерная актывізацыя выхавання на традыцыях старэйшых пакаленняў, забеспячэнне іх мэтазгоднай і прадуктыўнай пераемнасці.

З чаго пачынаецца выхаванне грамадзяніна? З прывіцця любові да родных мясцін, “малой радзімы”, яе гісторыі, людзей, хараства прыроды, бацькоўскага дому, гераічнага мінулага. Спадчына, якая нам дасталася ад продкаў, цікавая і багатая на музычную культуру, традыцыі, на нейкую аўру дабрыні і павагі да кожнага чалавека.

Усе гэтыя асаблівасці можна прасачыць у творчасці В.Быкава, які належыць да першасных велічынь сярод творчых постацяў беларускай літаратуры. Выдатны празаік, тонкі псіхолаг, мастак, надзвычай чуйны да зрухаў у грамадскім і духоўным жыцці. Толькі такі чалавек, занепакоены ўсім, што робіцца ў свеце, мог стварыць такія творы. Вось што адзначаў П.Дзюбайла пра аповесць “Знак бяды”: “ Аповесць “Знак бяды” – твор аб нечалавечых пакутах і аб сапраўднай чалавечнасці, аб сіле  і нязломнасці чалавечага духу, сапраўды народнага характару”.

Дадзеная метадычная распрацоўка дапаможа навучэнцам узнавіць веды пра асноўныя этапы жыцця і творчасці аўтара, раскрыць яго феномен у беларускім мастацкім слове, дапаможа акрэсліць асаблівасці яго творчасці, на прыкладзе аповесці “Знак бяды” паказаць суровую праўду вайны і гуманізм у паказе народнага подзвігу; прасачыць, як у творы ўслаўляецца чалавек, яго духоўныя каштоўнасці, будзе садзейнічаць і пашырэнню гістарычнай дасведчанасці навучэнцаў, выхаванню гонару за сваю багатую гісторыка – культурную спадчыну. Навучэнцы змогуць заўважыць, што толькі такі чалавек мог адкрыць сваім чытачам свет і чалавека такімі, якімі яны былі ў XX стагоддзі: няпростымі, драматычнымі, зменлівымі.

Прапанаваны матэрыял будзе карысны выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры і дапаможа пры правядзенні ўрокаў па творчасці В.Быкава.

**Тэма ўрока: Жыццёвы і творчы шлях В. Быкава. Асаблівасці кампазіцыі аповесці «Знак бяды»**

**Мэты ўрока:**

1. Стварыць на ўроку неабходныя ўмовы для  паўтарэння і сістэматызацыі ведаў пра асноўныя этапы жыцця і творчасці В.Быкава, засяродзіць увагу на адметнасці творчага аблічча пісьменніка непаўторнасці яго таленту.

2. Паспрыяць навучэнскаму разуменню філасофскага зместу аповесці, асэнсаванню яе наватарства і месца ў творчай спадчыне В. Быкава.

3. Развіваць эмацыянальную чуласць навучэнцаў, іх творчае ўяўленне.

4. Выхоўваць пачуццё нацыянальнай самасвядомасці, актыўнай грамадзянскай пазіцыі.

**Тып  урока**: урок вывучэння новага вучэбнага матэрыялу.

**Эпіграф да ўрока**: "Расказваю пра вайну, бо ненавіджу яе."

В.Быкаў

Будуць часам ідалы раструшчаны.

Свет разумны

Стоміцца ад крыкаў.

Васільком у жыце Беларушчыны

Назаўсёды застанецца Быкаў.

Р.Барадулін

**Абсталяванне:** партрэт Васіля Быкава, фотаздымкі; кніжная выстава твораў пісьменніка, прэзентацыя.

**Ход урока**

**1. Арганізацыйны момант**

**2. Мэтавызначэнне**

**3. Разгляд новай тэмы.  Уступнае слова выкладчыка**

Сённяшні наш урок звязаны непасрэдна з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны.

Прыгадайце творы, аўтары якіх апісвалі падзеі, звязаныя з гэтай старонкай нашай гісторыі.(М.Лынькоў «Васількі», Р.Барадулін «Бацьку»)

Вайна пакінула жахлівы след у гісторыі нашай краіны. Гэта вечны боль і сумны ўспамін пра загінуўшых. Гэта пачуццё ўдзячнасці ім за падараваны мір і спакой.

Да падзей тых часоў звяртаюцца пісьменнікі, каб нагадаць нашчадкам і папярэдзіць іх, што трэба зрабіць усё, каб вайна ніколі не паўтарылася. Сярод іх сусветна вядомы пісьменнік, чые творы перакладзены больш чым на 50 моў свету, гэта Васіль Быкаў. Ён быў непасрэдным удзельнікам гэтай вайны, прайшоў яе са зброяй у руках (Выкладчык звяртаецца да эпіграфа 1).

**Паведамленні навучэнцаў**

Навучэнец -“гісторык”. Паводле звестак ЮНЕСКА, напрыканцы 70-х гадоў ХХ ст. Васіль Быкаў быў адным з самых вядомых пісьменнікаў у свеце. Ды і сёння не зменшылася яго папулярнасць: быкаўскія творы перакладзеныя больш чым на пяцьдзесят моваў свету, у тым ліку на англійскую, іспанскую, італьянскую, нямецкую, французскую, японскую. Кнігі В. Быкава выходзілі ў Варшаве, Берліне, Празе, Будапешце, Сафіі, Мілане, Парыжы, Лондане, Каіры. Пра яго і сёння пішуць у папулярных газетах Расеі, Францыі, Германіі, Італіі, Польшчы, Швецыі, Фінляндыі...

Васіль Быкаў узнагароджаны Залатой Зоркай Героя Сацыялістычнай працы, ордэнам Айчыннай вайны І ступені, яму нададзена ганаровае званне "Народны пісьменнік Беларусі", ён уганараваны Ленінскай прэміяй за аповесць "Знак бяды" і Дзяржаўнай прэміяй Беларусі імя Якуба Коласа за аповесці "Воўчая зграя", "Яго батальён", прэстыжнай расійскай прэміяй "Трыумф".

Навучэнец -"краязнаўца" працягвае далей, што Васіль Уладзіміравіч Быкаў нарадзіўся 19 чэрвеня 1924 года ў вёсцы Бычкі Ушацкага раёна Віцебскай вобласці. Выступае вучань -"біёграф".

Навучаўся Васіль Быкаў на скульптурным аддзяленні Віцебскага мастацкага вучылішча. Скончыў Саратаўскае пяхотнае вучылішча. У 1942 годзе будучы пісьменнік уступіў у шэрагі Чырвонай Арміі. Ваяваў на Другім і Трэцім Украінскіх франтах, прайшоў па тэрыторыі Румыніі, Балгарыі, Вэнгрыі, Югаславіі, Аўстрыі, двойчы быў паранены.

Пасля даецца слова вучням -"бібліёграфам". Упершыню творы Васіля Быкава былі апублікаваны ў 1947 годзе, аднак творчая біяграфія пісьменніка пачынаецца з апавяданняў, напісаных у 1951 годзе. Тэматыка ранніх апавяданняў, дзеючымі асобамі якіх сталі жаўнеры і афіцэры, вызначыла далейшы лёс Быкава, многія з твораў якога прысвечаны падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Бескампраміснасць прозы Быкава стала прычынай нападаў савецкай крытыкі, якая абвінавачвала пісьменніка ў ачарненні савецкага ладу.

У 1974 годзе Васіль Быкаў быў узнагароджаны Дзяржаўнай прэміяй СССР (за аповесць "Дажыць да світання", 1973), у 1980 годзе атрымаў званне Народнага пісьменніка Беларусі, у 1986 годзе - быў уганараваны Ленінскай прэміяй за аповесць "Знак бяды". Многія творы пісьменніка, такія як аповесці "Трэцяя ракета" (1962), "Дажыць да світання", былі экранізаваны.

Навучэнец-"біёграф". З 1972 па 1978 год Васіль Быкаў займаў пасаду сакратара Гарадзенскага аддзялення Саюзу пісьменнікаў БССР.

Вядомасць Васілю Быкаву прынесла аповесць "Трэцяя ракета", напісаная ў 1962 годзе. У 1960-е ён публікуе аповесці "Альпійская балада", "Мёртвым не баліць", у 1970-я - "Сотнікаў", "Абеліск", "Дажыць да світання", "Пайсці і не вярнуцца". Гэтыя творы паставілі Васіля Быкава ў адзін шэраг з выдатнымі майстрамі ваеннай прозы XX стагоддзя.

Некалькі апошніх гадоў пісменнік жыў за межамі Беларусі.У снежні 2002 году Васіль Быкаў пераехаў на сталае жыхарства ў Чэхію. Тады пісьменнік сказаў, што ён "даўно марыў пасяліцца ў Чэхіі, заўсёды меў сімпатыю да гэтай краіны і яе грамадзянаў". У рашэнні праблемы пераезду Быкава ў Чэхію актыўны ўдзел прымала канцылярыя чэшскага прэзідэнта і асабіста Вацлаў Гавэл. Некалькі апошніх гадоў Герой Сацыялістычнай Працы, лаурэат Ленінскай прэміі, народны пісьменнік Беларусі пражываў у ФРГ, а да гэтага ў Фінляндыі.

Народны пісьменнік Беларусі Васіль Быкаў памёр 22 чэрвеня 2003 года у Бараўлянах, пад Менскам.

Выкладчык: Сімвалічная гэта дата. Вайна, пра якую ўсё жыццё расказваў Быкаў, не пакінула яго і праз гады, нагадала аб сабе нават днём яго адыходу.(настаўнік звяртаецца да эпіграфа 2)

Навучэнец -"краязнаўца". 19 чэрвеня 2003 года, Васілю Быкаву споўнілася 79 гадоў. У гэты дзень у райцэнтры Старыя Дарогі, на тэрыторыі прыватнага музэю выяўленчага мастацтва прайшло адкрыццё памятнага знака ў яго гонар. Пры жыцці помнік ставяць толькі лепшым з лепшых... Гранітны камень з бронзавым барэльефам Васіля Быкава стаіць зараз у музеі побач з іншымі памятнымі знакамі ў гонар знакамітых беларусаў. Тут ужо ўвекавечаныя імёны, напрыклад, дзяржаўнага дзеяча Вялікага Княства Літоўскага Льва Сапегі, паэта Максіма Багдановіча, паэтэсы Ларысы Геніюш. ( Праз эпідыяскоп можна паказаць фотаздымкі).

Выкладчык: Імя В.Быкава для ўсёй Беларусі -- знакавае. Гэта імя па-сапраўднаму вялікага пісьменніка, якога пры жыцці называлі класікам і духоўным прарокам нацыі.

Пасля даецца слова навучэнцам - “ літаратуразнаўцам” .

Алесь Адамовіч назваў аповесць «Знак бяды», напісаную ў 1982 годзе, самай антываеннай з усіх быкаўскіх твораў, бо тут вайна выкрываецца вачыма, ацэнкай тых, каму яна заўсёды здавалася такой дзікай і бесчалавечнай. У адрозненне ад цэнтральных герояу папярэдніх быкаўскіх твораў галоўныя героі аповесці «Знак бяды» Пятрок і Сцепаніда не з'яўляюцца ні салдатамі, ні партызанамі, ні падпольшчыкамі. Але вайна прымушае і іх зрабіць свой выбар, а выпрабаванне герояў сітуацыяй выбару — адметная асаблівасць творчасці Васіля Быкава, верным якой, як і праўдзе жыцця, ён застаецца заўсёды.

І перамежаваны паказ сучаснага і мінулага характэрны для яго творчасці, чым дасягаецца глыбокі псіхалагізм твора. Быкаў застаецца верным сабе і няўмольнай ісціне: усё мае свае вытокі, нічога выпадковага не бывае; наперакор жыццю і самым складаным абставінам Чалавек застаецца верным сабе і сваім маральным прынцыпам.

Па словах Васіля Быкава, «адно з самых недаравальных злачынстваў сталінчшыны — ліквідацыя традыцыйнай хрысціянскай маралі, спрадвечнай сістэмы элементарных жыццёвых правілаў, звычайна не надта паважанага, але нязменнага ў жыцці здаровага сэнсу. Некалі імі ў поўнай меры валодаў народ, цяпер жа не валодае ніхто».

Масавы генацыд, разбурэнне гнёздаў, калечанне лёсаў, давядзенне людзей да адчаю, крах веры, ідэалаў... Разрываюцца самыя моцныя сувязі паміж людзьмі — кроўныя, роднасныя. Жаніх, вымушаны «раскулачваць» нявесту, даведзены да адчаю, канчае жыццё самагубствам. Але самае страшнае, як зазначае пісьменнік, разбураецца народная мараль, ствараюцца абставіны, што правакуюць чалавека на выяўленне не самых лепшых яго якасцей, нават «мабілізуюць», рэалізуюць самыя ганебныя; больш таго — заахвочваюцца, а бар'ераў для такіх «мярзотнасцей» ужо не існуе, яны знічшаны.

Навучэнец -"“гісторык”:”

Тая праўда, тая трагедыя, якую зведаў і сам пісьменнік яшчэ ў дзяцінстве, засталася і знайшла сваё хвалюючае мастацкае ўвасабленне ў аповесці. Так успамінае Васіль Быкаў сваё, як ён сам вызначыў, «нешчаслівае дзяцінства»: «Раптам заплача маці. Такога ніколі не было, калі нешта там здаралася ў яе з бацькам, яна проста маўчала. А тут — наўзрыд, давячыся слязьмі, плача. Я, помню, прачнуўся, падхапіўся. Аказваецца, учора арганізаваліся ў калгас і сёння, значыць, раніцай прыехалі і з засекаў, з кадушак у пуньцы забралі ўсё насенне. А гэта якраз час сеяць. І чым дзяцей карміць, і што самой есці? Ну вось з гэтага пачалося. Трохі бульбы было, мяшалі з травой. І такое харчаванне працягвалася шмат гадоў. Зямля благая, ураджаі дрэнныя. Бацька ж з маці працавалі штодня. А прыносяць паўмяшка. Гэта ўсё, што за год зарабіў. А яшчэ і пастаўкі, падаткі з прысядзібнага агарода...»

Навучэнец - “ літаратуразнаўца”:

Наогул, жыццёвая аснова аповесцей (прыгадаем, што правобразамі Петрака і Сцецаніды з'явіліся бацькі пісьменніка) — яшчэ адна асаблівасць творчасці Васіля Быкава. Аднак было б вельмі спрошчана і павярхоўна ўсведамляць назначэнне гэтых галоўных вобразаў толькі ў сцвярджэнні трагізму вайны і яе ўсенароднасці. Гэта аповесць да ўсяго, бадай, самая філасофская. І філасофія твора выяўляецца не толькі рэалістычнымі сродкамі, але найперш праз умоўнасці, знакі, сімвалы, што і вылучае гэты твор з усёй творчасці Васіля Быкава як самы дасканалы і высокамастацкі не толькі па змесце, але і па форме. Адзін з крытэрыяў мастацкай вартасці любога твора вычарпальна сфармуляваны Мапасанам: «Геніяльным з'яўляецца толькі такі твор мастацтва, які адначасова ўяўляе сабой сімвал і дакладнае выражэнне рэчаіснасці». Аповесць «Знак бяды» ў поўнай меры адпавядае гэтаму крытэрыю.

Навучэнец-"“гісторык”:

Аповесць «Знак бяды» — не толькі самы антываенны, але і самы нацыянальны з усіх твораў Васіля Быкава. У чым жа гэта нацыянальнае ў творы? Васіль Быкаў у публіцыстычных артыкулах не раз даводзіў, што самая вялікая трагедыя беларускага народа звязана з несупыннымі войнамі, рэпрэсіямі, у выніку якіх вынішчаецца генафонд нацыі,

гінуць самыя лепшыя, а значыць, вынішчаецца векавая народная мараль, духоўнасць як найвялікшае багацце нацыі, што вядзе да разрыву повязі вякоў і пакаленняў.

«Порвалась связь времен» — і рушацца царствы, сем'і, рушыцца ўсё. Гэтым творам Васіль Быкаў паказаў вытокі і нашых сённяшніх бед і няшчасцяў, нашай бездухоўнасці. З нічога і будзе нішто. Адкуль жа нам быць духоўна багатымі, калі Багацькі загінулі...

Сімвалічныя, знакавыя не толькі гібель Петрака і Сцепаніды, але і тое, ад каго яны сваю смерць прынялі, Сталінізм і фашызм — прычына самай вялікай трагедыі беларускага народа, які не быў гаспадаром на сваёй зямлі, як і Багацькі ў сваёй хаце. Няволя, нясіла... Але ж усё мінаецца, і рабства таксама не бывае вечным. Трагедыя наша ў тым, што Багацькі так і не дачакаліся ўнукаў, не сустрэліся з імі ў гэтым жыцці. І не перадалі ім векавую народную мараль і тыя прынцыпы, па якіх жылі і ад якіх не адступіліся нават пад страхам смерці. І тым гэты знак папераджальны і для ўсіх нас...

**4. Закончыць урок можна літаратурнай віктарынай "Што ты запомніў з жыцця і творчасці Васіля Быкава?"**

1. Узгадайце вядомыя вам творы В.Быкава. Да асвятлення якіх гістарычных падзей звяртаецца ў іх аўтар?

2. Якімі паўстаюць са зместу твораў В.Быкава Беларусь і яе гісторыя, беларускі народ і яго характар? Адказ пракаменціруйце прыкладамі з твораў пісьменніка.

3. Калі была напісана аповесць "Знак бяды"?

4. Якую ацэнку яна атрымала з боку прафесійных даследчыкаў?

5. Хто з'яўляецца галоўнымі героямі твора?

**5. Падвядзенне вынікаў урока, выстаўленне адзнак**

**6. Рэфлексія**

- Што вас асабліва ўразіла ў біяграфіі В.Быкава?

**7. Дамашняе заданне**

1. З усёй вядомай вам інфармацыі пра Быкава-пісьменніка і чалавека выберыце толькі адзін факт, пра які напішаце адным абзацам свайму замежнаму сябру. Або зрабіце тэзісы артыкула падручніка «Творчыя набыткі» (с. 345—350), каб яны датычыліся толькі адметнасцей твораў В. Быкава.

2. Узнавіць змест аповесці «Знак бяды».

**Тэма: Вобразы здраднікаў. Разбурэнне духоўнасці страшней за акупацыю**

**Мэты**:

- ✓ прасачыць працэс разбурэння ўнутранага свету герояў і даследаваць, як у творы вырашаецца праблема маральнага выбару паміж подзвігам і здрадніцтвам;
- ✓ адзначыць духоўную моц асобных персанажаў аповесці; дапамагчы зразумець, чаму пісьменнік адмаўляў вядучую ролю жанчыны ў жыцці грамадства, кіруючыся духоўнымі прынцыпамі нацыі і народа;
- ✓ развіваць уменне параўноўваць герояў, аргументаваць свае ацэнкі, меркаванні тэкстам;
- ✓ спрыяць выхаванню ў навучэнцаў патрыятызму, пачуцця чалавечай годнасці і адказнасці за свае ўчынкі.

**Тып урока**: дыскусія.

**Абсталяванне:** эпіграф, афармленне дошкі, партрэт пісьменніка, прэзентацыя, мастацкі фільм “Знак бяды”.

**Эпіграф: “**Голас Васіля Быкава – голас сумлення нацыі,голас часу,які не ўкладваецца ў загадзя накрэсленыя зверху схемы”

Рыгор Барадулін .

На дошцы пададзены слоўнік:

акупацыя – часовае заняцце войскамі чужой дзяржаўнай тэрыторыі;

духоўны – 1) які належыць да разумовай дзейнасці,звязаны з унутраным светам чалавека; 2) які належыць да царквы,духавенства;

сімвал – умоўны знак.

Цытаты з аповесці “Знак бяды”:

“Каму яна патрэбна стала, зямля, даўно ўся сварка праз яе адпала, а міру з таго не пабольшала. Людзі разбэсціліся...”(Пятрок)

“Ці, можа, у ёй самой што змянілася, перайначылася, надламалася, спапялела, спрахнула. Яна шмат чаго не разумела, але добра адчувала адно: так не павінна быць ...”(Сцепаніда).

**Ход урока**

**I.Уступнае слова выкладчыка**

Здаецца, няма на свеце нічога страшней за вайну, якая нясе смерць, кроў, разбурэнні, і прыводзіць словы Сцепаніды: ”Вайна ўчапілася лапаю, улезла ў хату, на самы покуць, пад абразы “. Але пісьменнік Васіль Быкаў лічыў, што ёсць яшчэ больш жахлівая з’ява, чым

вайна, - разбурэнне духоўнасці народа. Што гэта за з’ява, якая яна, у чым яна выяўляецца – праблема для абмеркавання на ўроку.

Папярэдне навучэнцы атрымалі дамашняе заданне, дзе ад іх патрабавалася:

1. Успомніць вобразы здраднікаў у аповесці “Знак бяды”.

2. Прачытаць і прааналізаваць тэкст, дзе пададзены роздумы герояў – Петрака і Сцепаніды: раздзелы 2,12,14,15,20.

3. Звярнуць увагу на сімвалы:

-ліпа на падворку, крыж на Петраковай Галгофе, скрыпка, неўзарваная бомба.

**II.Выказванні навучэнцаў па тэме ўрока**

-выкладчык выслухоўвае навучэнцаў, дапаўняе, робіць абагульненні.

**III. Правядзенне дыскусіі**

Пытанні:

1. Дзе бярэ пачатак працэс разбурэння духоўнасці ў аповесці “Знак бяды” Васіля Быкава? Навошта пісьменнік выкарыстаў прыём інверсіі або рэтраспектывы?

2. Як выглядае чалавек, у якога разбураны ўнутраны свет (разбурана духоўнасць)?

3. Пятрок выказаў свой погляд на такога разгубленага чалавека: “Хаця ім што... ім абы жорсткасць сваю спраўляць, упівацца сілай, людскую кроў піць.

Без крыві засмяглі б іх глодкі. І гарэлкаю не размочаць. Ім пасля крыві гарэлку давай, а пасля гарэлкі зноў на кроў цягне. Во па гэтым коле і носяцца. Ах, зверугі, зверугі!”

4. Якія ўражанні пакідае цытата або думкі Петрака?

5. Ці можна назваць прычыны такіх паводзінаў паліцаяў?

6. Як вы думаеце, хто можа дапамагчы ім стаць людзьмі ?

7. Хто сярод іх лепшы, на вашу думку?

8. Чаму разбурэнне духоўнасці страшней за акупацыю? Чым страшней?

9. Як можна героям дапамагчы пазбавіцца бяды? (скіроўваецца ўвага на эпіграф).

10. Як вы ўспрымаеце канцоўку твора?

11. Калі б Пятрок быў побач са Сцепанідай, ці здарылася б такая трагедыя?

12. Ці застаўся б Пятрок са Сцепанідай у істопцы ў час пажару?

Сумленне – вузкая сцяжынка, якая можа выратаваць чалавецтва ад бездухоўнасці,і падыходзім да самага важнага пытання:

- Чаму разбурэнне духоўнасці страшней за акупацыю? (акупацыя - асовая з’ява, разбурэнне духоўнасці – доўгі, цяжкі, невыносны працэс, здольны знішчыць цэлую нацыю, народ. Гэта і ёсць асноўная праблема, што хвалявала В.Быкава ў аповесці ).

- Якая роля сімвалаў у раскрыцці задумы аўтара ?

**IV. Заключнае слова выкладчыка**

**V. Дамашняе заданне**

С.334-335; творчая работа.

**Дадатак 1**

## Храналагічная табліца жыцця В.Быкава

| Дата | Падзея |
|---|---|
| 19 чэрвеня 1924 года | нарадзіўся Васіль Уладзіміравіч Быкаў у невялічкай вёсцы Бычкі на Ушаччыне ў сялянскай сям'і |
| 1935 год | закончыў Бяляеўскую пачатковую школу |
| 1939 год | пасля заканчэння 8 класаў Кубліцкай сярэдняй школы, вырашае паступіць у Віцебскае мастацкае вучылішча. Там навучэнцам плацілі прыстойную па сялянскіх мерках стыпендыю, ажно 60 рублёў. Але ў 1940 г. адмянілі стыпендыю і ўвялі плату за навучанне, Быкаў вяртаецца дадому і працягвае вучобу ў 10 класе |
| 1941 год | едзе паступаць на Украіну ў горад Шостка Сумскай вобласці ў індустрыяльны інстытут, але яго тут застае вайна |
| 1947 год | дэмабілізаваўся і спыніўся ў Гродне,працуе журналістам у абласной газеце "Гродзенская праўда" |
| 1948-1949 гг. | у гэтай газеце былі надрукаваны першыя апавяданні на рускай мове " У той дзень" і "У першым баі" |
| у 1949 годзе | прызываюць у армію і амаль яшчэ 6 гадоў Быкаву давялося служыць у розных гарнізонах на Украіне, Беларусі, Далёкім Усходзе |
| з 1956 – 1972 гг. | працуе літаратурным супрацоўнікам, літ.кансультантам газеты "Гродзенская праўда" |
| 1957- 1959 гг. | час творчага пошуку Быкавым сваіх герояў, тэм, жанраў |
| на мяжы 60-70-х гг. | у творчасці Быкава заўважаюцца якасныя змены, звязаныя яшчэ з большым паглыбленнем праўдзівасці, з паказам супярэчлівасці і складанасці вайны. На першы план аўтар вылучае маральна-філасофскую праблематыку з пошукам ісціны, справядлівасці. Гэта вельмі поўна выявілася ў "партызанскім " цыкле твораў Быкава аб вайне – апавяданне "Сваякі", аповесці "Круглянскі мост", "Пайсці і не вярнуцца", "Воўчая зграя", "У тумане", "Сотнікаў" і іншыя |
| другая палова 70-х | пераезд у Мінск |

| | |
|---|---|
| 1980 год | прысвоена ганаровае званне народнага пісьменніка Беларусі |
| у 1990 годзе | Быкаў абраны прэзідэнтам Згуртавання беларусаў свету “Бацькаўшчына” |
| з 1998 года | быў вымушаны выехаць за мяжу, прытулак яму давалі Фінляндыя, потым – ФРГ, затым - Чэхія |
| 2003 год | вяртаецца ў Мінск ужо невылечна хворы (рак), каб памерці на радзіме. Смерць наступіла 22 чэрвеня 2003 года |
| | **Літаратурныя ўзнагароды** |
| 1978 год | Дзяржаўная прэмія СССР за аповесці “Абеліск”, ”Дажыць да світання”;<br>Дзяржаўная прэмія БССР імя Я.Коласа за аповесці “Воўчая зграя”,”Яго батальён” |
| 1986 год | Ленінская прэмія за аповесць “Знак бяды” |

**Дадатак 2**



## Васіль Быкаў. Факты, якія ведае не кожны беларус

"Чалавек без пакут – трава", – пісаў Васіль Быкаў у сваёй аповесці "Трэцяя ракета". Васіль Уладзіміравіч ведаў, што казаў: менавіта ў яго жыцці пакут хапала. Але і чалавекам ён быў і застаецца сапраўдным

## 1. Быкаў мог стаць мастаком ці скульптарам

Далёка не кожны беларус ведае, што свой лёс Быкаў мог звязаць з маляваннем, калі б… не загад Сталіна. Пасля заканчэння школы ва ўзросце 15 год Васіль Уладзіміравіч паступіў на скульптурнае аддзяленне Віцебскага мастацкага вучылішча. Але правучыўся там толькі год. У сваёй аўтабіяграфічнай аповесці "Доўгая дарога дадому" ён сціпла ўспамінаў: *"Вучыцца там доўга не прыйшлося, бо ў 1940 годзе стыпендыю адмянілі, і гэтая абставіна вярнула мяне ў вёску".*







Замалёўкі Васіля Быкава. Фота: svaboda.org

Аднак гэты эпізод з жыцця насамрэч быў больш драматычным, успамінала сястра класіка Валянціна Уладзіміраўна. Акрамя таго што стыпендыі адмянілі, за навучанне пачалі браць плату, суадносную з коштам каровы. Аднак прадаць жывёлу – значыла выракчы звычайную вясковую сям'ю на галодную смерць.

*"А маляваў так добра! <...> Прынялі яго, правучыўся год. А перад самай вайной выйшаў указ Сталіна: трэба было плаціць дужа многа за вучобу. <...> Бацька напісаў: я ж не магу, дзіцятка, дзе ж узяць столькі грошай? Прыехаўшы дамоў, [Быкаў] плакаў, помню, плакаў..."*

## 2. Пісьменніка памылкова "пахавалі" падчас вайны і ўшанавалі на помнікавым абеліску

Падчас удзелу ў Кіраваградскай аперацыі (Украіна) на Вялікай Айчыннай вайне Васіль Быкаў быў цяжка паранены ў плячо і жывот. Памылкова яго запісалі як загінулага, а родныя Быкава атрымалі "пахаронку". Да таго ж яго імя было засведчана на помнікавым абеліску ў гэтых мясцінах.



Васіль Быкаў. 1944 г. Фотахроніка БЕЛТА



Васіль Быкаў. 1944 г. Фотахроніка БЕЛТА

Аднак адна дэталь дапамагла сям'і зразумець, што ўсё гэта памылка: перад "пахаронкай" родныя атрымалі ліст ад самаго Васіля Быкава. Пазначаная дата сведчыла, што ліст ад сына быў адпраўлены пазней за паведамленне пра гібель.

*"Я напісала пісьмо Васілю, што "пахаронку на цябе палучылі". Тады ён адказаў: "Ну, праўда, я быў біты, але не дабіты!" Любіў пажартаваць",* - расказвала сястра класіка.

## 3. У Беларусі ёсць толькі адна вуліца Быкава і дзясяткі – Леніна

Па апошніх дадзеных, у нашай краіне існуе толькі адна вуліца, названая ў гонар Васіля Быкава: яна знаходзіцца ў пасёлку Ждановічы пад Мінскам. Гэткую назву яна атрымала адносна нядаўна, пару год таму, дзякуючы ініцыятыве мясцовых жыхароў. У той жа час у Беларусі застаюцца шматлікія дзясяткі вуліц Савецкіх, Кастрычніцкіх, Цэнтральных і Леніна.

У Гродна, Мінску і Салігорску ў свой час таксама выказваліся за ўшанаванне імя Быкава ў назвах вуліц, але з гэтага нічога не атрымалася. Не дапамаглі нават 105 тысяч подпісаў, сабраных у 2012 годзе ў сталіцы. Так жа скончылася ініцыятыва назваць адну са станцый будучай трэцяй лініі Мінскага метрапалітэну імём Быкава, у падтрымку якой падпісаліся 35 тысяч грамадзян.

Восенню 2013 года ў СМІ паведамлялі, што адна з вуліц у новым мікраараёне індывідуальнай забудовы "Ліпкі" горада Смалявічы таксама будзе названая ў гонар Васіля Быкава.

## 4. Як італьянскі рэжысёр марыў зняць фільм па Быкаву, а Машэраў плакаў на прэм'ерным паказе

З фільмамі, што здымаліся па творах Васіля Быкава, звязаныя цікавыя гісторыі. Напрыклад, каб пазбегнуць неапраўданай цэнзуры кінастужкі "Восхождение" (1976), што здымалася па ваеннай аповесці "Сотнікаў", рэжысёр пайшла на невялічкі хітрык. У абыход "Масфільма" здымачная каманда запрасіла на першы прагляд Пятра Машэрава, які тады працаваў першым сакратаром ЦК КПБ. Напачатку былы партызан быў настроены скептычна (маўляў, што можа разумець у вайне жанчына – рэжысёр стужкі Ларыса Шапіцька). Аднак, па успамінах сведкаў, ужо на палове стужкі ён нават не хаваў сваіх слёз. Пасля прагляду Машэраў, у парушэнне традыцый, першым выйшаў на сцэну, дзе каля 40 хвілін дзяліўся сваім захапленнем. Праз пару дзён фільм афіцыйна прынялі без аніводнай праўкі.



"Восхождение", мастак Ю. Ракша (1977)



Афіша да фільма "Трэцяя ракета" (1963)



Плакат "Альпійскай балады", мастак С. Дацкевіч

А вось на адну з першых экранізацый твораў Быкава - па аповесці "Альпійская балада" - прэтэндаваў вядомы італьянскі кінарэжысёр Джузэпэ Дэ Санціс. У 1965 годзе ён звяртаўся да кіраўніцтва кінематаграфіі СССР з прапановай набыць правы на пастаноўку фільма. У Рыме гэтым часам нават пачаўся адбор акцёраў на галоўныя ролі Івана і Джуліі. Але яму адмовілі, і стужку "у працу" перадалі савецкаму рэжысёру Барысу Сцяпанаву. Ужо падчас здымак у СССР на кінапляцоўку спецыяльна прыехала італьянская акцёрка, якая некалі прайшла той самы конкурс на роль Джуліі ў Рыме. Жанчына прыляцела на самалёце толькі дзеля таго, каб убачыць калегу, якой пашчасціла здымацца ў фільме па

творы Быкава.

Сучасная экранізацыя аповесці "У тумане" (2012) рэжысёра Сяргея Лазніцы ўдзельнічала ў конкурснай праграме 65-га Канскага фестывалю, а прэм'ера фільма ў Мінску суправаджалася аншлагамі. Пазней фільм атрымаў шэраг узнагарод на іншых міжнародных конкурсах і актыўны водгук з боку прэсы. З гэтай нагоды імя Васіля Быкава было ўзгадана на старонках сусветнавядомай газеты New York Times падчас прэм'ерных паказаў фільма на Манхэтане ў ЗША.


Кадр з фільма "У тумане".

Акрамя кінастужак па творах Васіля Быкава, у 1967 годзе быў пастаўлены балет "Альпійская балада" Яўгена Глебава, а праз 2 гады - опера "Сцежкаю жыцця" (паводле "Воўчай зграі").

## Літаратура

1. Бугаёў, Д. Васіль Быкаў : нарыс жыцця і творчасці / Д. Бугаёў. — Мн. : Народная асвета, 1987. — 207 с. : іл. — (Народныя пісьменнікі БССР).

2. Быкаў, В. Праўдай адзінай : літаратурная крытыка, публіцыстыка, інтэрв'ю / В. Быкаў. — Мн. : Мастацкая літаратура, 1984. — 262 с.

3. Васіль Быкаў. Пяць фактаў, якія ведае не кожны беларус [Электронный ресурс]. – Режим доступа: news.tut.by.

4. “Знак бяды” кінафільм [Электронный ресурс]. – Режим доступа: kinofilms.tvfilm/znak-bedy.

5.Ляшук, В.Я. Вывучэнне творчасці пісьменніка: Васіль Быкаў у школе: Дап. для настаўнікаў агульнаадукац. устаноў / В.Я.Ляшук.- Мн.: “Аверсэв”, 2002.- 191 с.